УДК 378 (476) (091)

***А.М. Вабішчэвіч***

# КАФЕДРА ГІСТОРЫІ СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ БрДУ ІМЯ А.С. ПУШКІНА: СТАН, ВЫНІКІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ПРАЦЫ

Прэзентацыя кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна раскрывае асноўныя напрамкі яе навуковай дзейнасці, дасягненні і перспектыўныя планы прафесараў і выкладчыкаў. Вынікі гістарычных і сацыяльна-гуманітарных даследаванняў кафедры атрымалі прызнанне навуковай супольнасці ў Беларусі і за мяжой.

Кафедра гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (цяпер – дзяржаўнага ўніверсітэта) імя А.С. Пушкіна з’явілася ў структуры гістарычнага факультэта амаль з часу яго стварэння ў 1991 г. У перыяд арганізацыйнага станаўлення (1992–1999 гг.) кафедру ўзначальваў кандыдат гістарычных навук, дацэнт Шаўчук Ігар Іванавіч. Пасля яго загадчыкамі кафедры былі кандыдаты гістарычных навук, дацэнты Здановіч Уладзімір Васільевіч (1999–2004 гг.), Савіч Аляксандр Аляксандравіч (2004–2008 гг.). Пасля структурнага пераўтварэння ў 2008 г. – уз’яднання з кафедрай гісторыі культуры і рэлігіі – кафедра гісторыі славянскіх народаў набыла полідысцыплінарны профіль [1, с. 31; 2, с. 213]. На цяперашні момант яе ўзначальвае доктар гістарычных навук Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч.

Зараз кафедра гісторыі славянскіх народаў мае добры кадравы патэнцыял, у якім арганічна спалучаюцца сталасць дактароў і прафесараў, вопыт кандыдатаў навук і дацэнтаў, энергічнасць выкладчыкаў і аспірантаў. Акрамя загадчыка кафедры А.М. Вабішчэвіча, у кагорту дактароў, прафесараў трэба дадаць згаданага І.І. Шаўчука, а таксама Андрэя Аляксандравіча Гарбацкага, які з’яўляецца адначасова і прафесарам Універсітэта ў Беластоку (Польшча). У дадатак да названага А.А. Савіча сярод кандыдатаў навук, дацэнтаў неабходна адзначыць Аляксандра Аляксандравіча Башкова, Людмілу Паўлаўну Нікіценкаву, Аляксандра Мікалаевіча Свірыда. На выкладчыцкіх пасадах працуюць Віталь Юр’евіч Піліповіч, Ірына Ільінічна Ваўранюк, а Яўгенія Юр’еўна Занько завяршае навучанне ў аспірантуры. Пэўную дапамогу ў правядзенні навуковых даследаванняў аказвае і лабарант Лілія Юр’еўна Мелішкевіч.

Павышэнне навуковай кваліфікацыі кадраў з’яўляецца прыярытэтным напрамкам у дзейнасці кафедры. На працягу апошняга часу былі паспяхова абаронены 2 доктарскія дысертацыі, рыхтуюцца да абароны кандыдацкія дысертацыі. У доктарскай дысертацыі І.І. Шаўчука «Кадры гуманітарных наук БССР: станаўленне, фарміраванне, развіццё (20–30-я гг. ХХ ст.)» (2010 г.) выяўлены 2 напрамкі ў падрыхтоўцы кадраў гуманітарных навук, раскрыты яе асноўныя праблемы. У доктарскай дысертацыі А.М. Вабішчэвіча «Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» (2011 г.) выкладзена канцэпцыя навуковага даследавання праблемы нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. як цэласнай сістэмы існавання раз’яднанай часткі беларускай нацыі ў межах поліэтнічнай Польскай дзяржавы. Акрамя таго, А.М. Вабішчэвіч атрымаў Дыплом лаўрэата конкурсу ВАК Рэспублікі Беларусь за лепшую доктарскую дысертацыю 2011 г. у намінацыі «Гуманітарныя навукі». 7 лютага 2012 г. у Мінску на ўрачыстай цырымоніі ўручэння дыпломаў доктара навук і атэстатаў прафесара навуковым і навукова-педагагічным работнікам Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь

А.Р. Лукашэнка адзначыў у якасці прыкладу дасягненняў айчынных вучоных-гуманітарыяў доктарскую дысертацыю А.М. Вабішчэвіча [2].

Асноўнымі задачамі кафедры гісторыі славянскіх народаў у навуковай працы з'яўляюцца наступныя: удзел прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры, аспірантаў у рэалізацыі навукова-даследчых праектаў; актывізацыя навукова-даследчай работы з навучэнцамі (студэнтамі, магістрантамі); правядзенне навукова-арганізацыйных мерапрыемстваў, апрабацыя вынікаў даследаванняў (выданне манаграфій, курсаў лекцый, навучальных дапаможнікаў, артыкулаў, падрыхтоўка дакладаў для навуковых канферэнцый, укараненне ў навучальны працэс); навукова-метадычнае забеспячэнне для спецыяльнасцей гістарычнага факультэта («Гісторыя (рэлігій)» і інш.).

Трэба адзначыць пэўны ўклад прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры ў распрацоўку новых тэматычна-праблемных напрамкаў даследаванняў і істотнае ўзбагачэнне традыцыйнай праблематыкі гістарычнай навукі Рэспублікі Беларусь, сярод якіх варта вылучыць наступныя: гісторыя канфесій у Беларусі (гісторыя стараабрадніцтва, асобных праваслаўных манастыроў Беларусі, гісторыя ўніяцкай царквы ў ХХ ст.); грамадска-палітычныя працэсы, этнакультурнае развіццё, канфесійная жыццё ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.; гісторыя гуманітарных навук у БССР (1920–30-я гг.); праблематыка сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця беларуска-польскага памежжа ў ХХ ст.; гістарычнае краязнаўства (гісторыя і культура Берасцейшчыны); археалагічныя і этнаграфічныя даследаванні на тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

На працягу 2005–2014 гг. выкладчыкі кафедры прымалі (і працягваюць прымаць) удзел у выкананні 8 навукова-даследчых работ з нумарам дзяржрэгістрацыі, у тым ліку 2 – у рамках Дзяржаўных комплексных праграм, 1 – у межах беларуска-расійскага праекта, а таксама ў шэрагу іншых рэспубліканскіх і міжнародных праектаў. Так, у 2005–2007 гг. пры выкананні сумеснага праекта БРФФД і РГНФ А.М. Вабішчэвіч з беларускага боку ўзначальваў часовы калектыў, які ажыццяўляў НДР па тэме «Беларускія землі паміж Расіяй і Польшчай у ХІХ–ХХ стагоддзях: нацыянальна-культурныя і грамадска-палітычныя фактары гістарычнага развіцця». З расійскага боку партнёрам выступаў гістарычны часопіс «Родина» (г. Масква). У ходзе выканання дадзенага праекта праводзілася паглыбленае вывучэнне, сістэматызацыя і аналіз новай базы крыніц з архіўных устаноў Беларусі і замежных краін, значная частка якой упершыню была ўведзена ў навуковы абарот.

У 2011–2013гг. выконвалася тэма «Гісторыя гуманітарных навук у Беларусі (1920–1930-я гады)» (кіраўнік – прафесар І.І. Шаўчук) у межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі». Акрамя таго, цяпер рабочая група пад кіраўніцтвам І.І. Шаўчука прыступіла да падрыхтоўкі біябібліяграфічнага даведніка аб прафесарска-выкладчыцкім складзе БрДУ імя А.С. Пушкіна. Сталі ўжо традыцыйнымі навукова-даследчыя праекты па асобных раёнах Брэсцкай вобласці, якія выконваюцца на гаспадарчадагаварной аснове (кіраўнік – прафесар А.А. Гарбацкі). Праводзіліся даследаванні па Івацэвіцкім раёне, цяпер ажыццяўляецца праца па Іванаўскім і Маларыцкім раёнах. У ходзе правядзення гэтых даследаванняў упершыню ўведзены ў навуковы абарот новыя крыніцы па гісторыі і культуры (напрыклад, прывілеі аб наданні магдэбургскага права мястэчку Моталь і інш.).

Зараз на кафедры працягваецца рэалізацыя НДР «Грамадская-палітычныя, сацыякультурныя і канфесійныя праблемы беларусаў у кантэксце гісторыі славянскіх народаў у ХХ – пачатку ХХІ стст.». Хоць тэма яшчэ не завершана, але ўжо атрыманы не-

каторыя значныя вынікі: вызначана роля Праваслаўнай Царквы і яе арганізацыйных адзінак (у прыватнасці, Мінскай праваслаўнай епархіі, брацкіх арганізацый і манастыроў) у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці на беларускіх землях у асобныя храналагічныя перыяды; раскрыты змест, вылучаны асаблівасці сацыякультурнай дзейнасці асобных праваслаўных манастыроў Беларусі ў XIX – пачатку XX стст. (Чонскага манастыра, манастыроў Полацка); выяўлены фактары, якія ўплывалі на характар міжнацыянальных, міжканфесійных адносін на беларускіх землях у асобныя перыяды XX ст.; выяўлены асноўныя напрамкі, асаблівасці, выніковасць прамыслова-рамесніцкай вытворчасці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.; раскрыта спецыфіка рэпатрыянтаў Другой сусветнай вайны як адметнай сацыяльнай групы ў складзе насельніцтва Беларусі. Ужо выяўлены і ўведзены ў навуковы абарот значны масіў новых дакументальных крыніц з фондаў архіваў Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі.

У пачатку XXI ст. ў межах абласной і рэспубліканскай праграм па адраджэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны і праграмы Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі дацэнт А.А. Башкоў, выкладчык В.Ю. Піліповіч удзельнічалі ў археалагічных даследаваннях цэлага шэрагу помнікаў архітэктуры Брэсцкай вобласці: палаца Пуслоўскіх у Косаве Івацэвіцкага раёна (XIX ст.), палаца Сапегаў у Ружанах Пружанскага раёна, палацава-паркавага комплекса XVII–XVIII стст. у Воўчыне Камянецкага раёна, манастыра картэзіянцаў XVII–XVIII стст. у Бярозе, фамільнай капліцы Ажэшкаў у Закозелі Драгічынскага раёна, Цярэспальскіх варот Брэсцкай крэпасці, сядзібы Дастаеўскіх XVI–XVIII стст. у Дастоеве Іванаўскага раёна, палацава-паркавага ансамбля Нямцэвічаў XVII–XIX стст. у Скоках Брэсцкага раёна і інш.

Асаблівая ўвага звяртаецца на апрабацыю вынікаў даследавання. Толькі на працягу 2006–2014 гг. прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры падрыхтаваў 12 манаграфій, 1 курс лекцый (у 3-х частках), 5 зборнікаў матэрыялаў канферэнцый, 2 навукова-папулярныя выданні, 2 даведнікі і зборнікі дакументаў, а таксама прымаў удзел у выданні шэрагу энцыклапедый, зборнікаў матэрыялаў канферэнцый і мноства артыкулаў у розных навуковых, навукова-папулярных і вучэбна-метадычных айчынных і замежных выданнях.

Сярод найбольш значных манаграфій А.М. Вабішчэвіча трэба адзначыць наступныя: «Гісторыя Беларусі : у 6 т.». – Т. 5 (Мінск, 2006) (у сааўт.); «Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» (Брэст, 2008); «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці» (Мінск, 2012) (у сааўт.), «Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн.». – Кн. 1–2 (Мінск, 2014) (у сааўт., у тым ліку А.А. Савіч). У іх выкладзены канцэптуальныя падыходы, змястоўны факталагічны матэрыял аб этнакультурным развіцці заходнебеларускага рэгіёну ў 20–30-я гг. XX ст. А.М. Вабішчэвіч таксама ўдзельнічаў у падрыхтоўцы зборніка дакументаў і матэрыялаў «Польша–Беларусь (1921–1953)» (Мінск, 2012).

У манаграфіі А.А. Гарбацкага «Православные монастыри Беларуси: история и современность. Чонский монастырь» (Брэст, 2011) упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы прадстаўлена цэласная карціна гісторыі Чонскаго манастыра ад узнікнення ў другой палове XVIII ст. да ліквідацыі ў перыяд Першай сусветнай вайны, прааналізаваны асноўныя этапы яго станаўлення і развіцця. Пад агульнай рэдакцыяй А.А. Гарбацкага выдадзена калектыўная манаграфія «Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён» (Брэст, 2009). Вынікі даследаванняў І.І. Шаўчука па гісторыі гуманітарных навук БССР у міжваенны час былі канцэптуальна прадстаўлены ім

у манаграфіі «Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гг. XX ст.)» (Брэст, 2007).

А.А. Башкоў у манаграфіі «Христианские древности Беларуси конца X–XIV вв. (Предметы христианского культа индивидуального использования)» (Мінск, 2011) упершыню правёў комплексны аналіз прадметаў хрысціянскага культу індывідуальнага выкарыстання канца X–XIV стст., знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Яны ўяўляюць сабой значную крыніцу па вывучэнні сацыяльна-культурных пераўтварэнняў для правядзення адпаведнай гістарычнай рэканструкцыі. У манаграфіі А.А. Савіча «Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы» (Брэст, 2012) выяўлена дынаміка гістарыяграфіі заходнебеларускага руху, удакладнены і дапоўнены высновы, ацэнкі папярэдніх даследчыкаў, вызначаны як распрацаваныя, так і слаба ці недастаткова вывучаныя напрамкі. У ходзе комплекснага аналізу гісторыі ўніяцтва ў заходнебеларускім краі А.М. Свірыдам у манаграфіі «Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.)» (Брэст, 2012) выяўлены яго спецыфічныя рысы, формы, нацыянальная арыентацыя, раскрыты дагматычныя, кананічныя і абрадавыя асаблівасці Каталіцкай царквы візантыйска-славянскага абраду, вызначана ступень знешняга ўплыву на яе з боку грэка-каталіцкай царквы Львоўшчыны.

У апошнія гады актывізавалася супрацоўніцтва з польскімі вучонымі. Разам са спецыялістамі Галоўнай дырэкцыі польскіх архіваў, Аб’яднання польскіх архівістаў (Варшава), даследчыкамі з Універсітэта М. Каперніка (Торунь) А.М. Вабішчэвічам быў падрыхтаваны даведнік «Polska–Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939» (т. 1) (Варшава, 2013), у якім упершыню была распрацавана база пошуку дакументальных матэрыялаў па гісторыі заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы (1918–1939 гг.), якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці і Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. Пад яго рэдакцыяй таксама выдадзены сумесны беларуска-польскі зборнік навуковых прац «Polska–Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Powstanie styczniowe w tradycji i myśli politycznej Polski i Białorusi» (Варшава, 2014). Культурна-антрапалагічныя даследаванні А.А. Гарбацкага былі змешчаны ў калектыўнай манаграфіі «Pedagogika społeczna wobec zmian przestrzeni życia społecznego» (Варшава, 2013). Запланавана выданне калектыўнай манаграфіі па гісторыі Праваслаўнай Царквы ў Беларусі з удзелам беларускіх і польскіх аўтараў. Працягваецца распрацоўка базы пошуку дакументальных матэрыялаў заходнебеларускіх зямель міжваеннага часу, якія знаходзяцца ў фондах архіваў Рэспублікі Беларусь (у прыватнасці, у Занальным дзяржаўным архіве ў Маладзечне).

Кафедра з’яўлялася арганізатарам шэрагу значных навуковых мерапрыемстваў: міжнародных навукова-практычных канферэнцый «Праваслаўе ў духоўным жыцці Беларусі» (2007, 2011, 2013 гг.); Міжнароднай навукова-багаслоўскай канферэнцыі «Дабраверны князь Канстанцін (Васілій) Астрожскі – вядомы асветнік і абаронца Праваслаўя» (2008 г.), якія праводзіліся сумесна з Брэсцкай епархіяй Беларускай Праваслаўнай Царквы. Гэтыя канферэнцыі атрымалі высокую ацэнку беларускіх і замежных вучоных, органаў дзяржаўнага кіравання, царкоўнай і свецкай грамадскасці. Таксама былі праведзены канферэнцыі агульнанацыянальнага маштабу: Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Гісторыя і традыцыі беларускай навукі (да 90-годдзя Інстытута беларускай культуры)» (2012 г.); II Рэспубліканская студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя «Фальклор, гісторыя і літаратура беларусаў у кантэксце культурнай спадчыны славян» (2013 г.).

Вынікі працы кафедры ўжо атрымалі заслужаную станоўчую ацэнку ў Беларусі і за яе межамі. Кафедра ажыццяўляе супрацоўніцтва з БДУ, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, ААТ «Брэстрэстаўрацыяпраект», іншымі навуковымі і навучальнымі ўстановамі краіны. Распрацоўкі кафедры актыўна выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе ўстаноў адукацыі, у рабоце органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў культуры Брэсцкай вобласці ў справе адраджэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Выкладчыкі кафедры падтрымліваюць плённыя сувязі з Беластоцкім універсітэтам (Польшча), Чувашскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя І.Я. Якаўлева (г. Чабаксары, Расія), Інстытутам славяназнаўства РАН (г. Масква, Расія) і іншымі замежнымі навуковымі цэнтрамі і ўніверсітэтамі. Прадстаўнікі кафедры штогод прымаюць удзел у рабоце шматлікіх навуковых міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных канферэнцый у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой [3, с. 29].

Індывідуальныя заслугі прадстаўнікоў кафедры гісторыі славянскіх народаў адзначаліся ўзнагародамі ва ўніверсітэце, на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Загадчык кафедры А.М. Вабішчэвіч быў узнагароджаны прэміяй імя У.А. Калесніка БрДУ імя А.С. Пушкіна ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук (2009 г.), а таксама пісьмом падзякі Брэсцкага аблвыканкама. Прафесар А.А. Гарбацкі ўзнагароджваўся граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Прафесар І.І. Шаўчук быў адзначаны падзякай рэктара (2014 г.). Дацэнт А.А. Башкоў атрымліваў Прэмію з фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (2007 г.), грамату Брэсцкага аблвыканкама (2013 г.).

Асноўнымі формамі навукова-даследчай працы са студэнтамі і магістрантамі з’яўляюцца наступныя: навукова-даследчыя групы; індывідуальная праца з найбольш здольнымі навучэнцамі. Вядучыя спецыялісты ажыццяўляюць кіраўніцтва магістарскімі даследаваннямі. Цяпер на кафедры гісторыі славянскіх народаў эфектыўна працуюць студэнцкія навукова-даследчыя групы «Аматар археалогіі» (кіраўнік – дацэнт А.А. Башкоў), «Гісторыя Расіі XVIII–XIX стст.» (кіраўнік – дацэнт Л.П. Нікіценкава). Дыпломныя і курсавыя праекты, магістарскія дысертацыі, публікацыі навучэнцаў у часопісах, зборніках артыкулаў і матэрыялаў канферэнцый, іх даклады і рэфераты для навуковых канферэнцый і мерапрыемстваў рознага рангу прысвячаюцца актуальным праблемам гістарычных і сацыяльна-гуманітарных навук. Пільная ўвага звяртаецца на выкарыстанне новых крыніц (архіўных дакументаў, матэрыялаў палявых этнаграфічных даследаванняў, вуснай гісторыі і інш.). Пачала функцыянаваць культурна-антрапалагічная навуковая школа (кіраўнік – прафесар А.А. Гарбацкі). Важную ролю ў актывізацыі студэнцкай навуковай працы іграюць валанцёрскія студэнцкія атрады для правядзення археалагічных даследаванняў.

Акрамя таго, на кафедры гісторыі славянскіх народаў праводзіцца навуковае кіраўніцтва аспірантамі і суіскальнікамі. У 2011 г. пад кіраўніцтвам прафесара А.А. Гарбацкага паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю «Конфессиональная и социально-культурная жизнь Беларуси во второй половине XIX – начале XX вв. (на примере Минской православной епархии)» К.У. Марозька. Рыхтуецца да абароны яшчэ некалькі кандыдацкіх дысертацый па актуальных праблемах айчыннай гісторыі.

У цэлым з улікам назапашанага вопыту і выніковасці выканання навуковых праектаў на кафедры гісторыі славянскіх народаў ёсць магчымасці для рэалізацыі дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, гаспадарча-дагаварных тэм, індывідуальнай навуковай працы, навуковай экспертызы як на рэгіянальным, рэспубліканскім, так і міжнародным узроўнях па наступных напрамках: гісторыя традыцыйных канфесій і неа-

культаў на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XXI стст.; гісторыя і культура раёнаў, населеных пунктаў, асобных прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў Брэсцкай вобласці; этнаканфесійнае жыццё ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.; дынаміка беларуска-польскіх адносін у XX ст.; гісторыка-антрапалагічныя, краязнаўчыя і археалагічныя даследаванні; выяўленне, навуковая апрацоўка, выданне дакументаў і матэрыялаў па гісторыі, культуры, рэлігіі Брэсцкай вобласці (тэматыка па ўзгадненні з заказчыкам); навукова-пошукавая праца ў фондах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці па асобных тэмах (персаналіях) па заказах юрыдычных ці фізічных асоб. І для паспяховага іх выканання ёсць самае галоўнае – высокакваліфікаваны і адказны кадравы склад кафедры гісторыі славянскіх народаў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А.М. Гісторыкаў рыхтуе Берасцейскі ўніверсітэт / А.М. Вабішчэвіч // Вышэйшая школа. – 2005. – № 4. – С. 31–33.
2. Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна. Старонкі гісторыі: 60-годдзю БрДУ прысвеч. / пад агульнай рэд. М.Э. Часноўскага. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2005. – 250 с.
3. Афіцыйны Інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу : http://president.gov.by/ru/news_ru/view/7-fevralja-glava-gosudarstva-vruchil-diplomy-doktora-nauk-i-attestaty-professora-luchshim-uchenym-i-pedagogam-494/. – Дата доступу : 29.10.2014.
4. Вабішчэвіч, А.М. Гістарычны факультэт Брэсцкага ўніверсітэта ў пачатку XX стагоддзя: асноўныя напрамкі дзейнасці, вынікі працы і перспектывы развіцця / А.М. Вабішчэвіч // Личность в истории: героическое и трагическое : сб. материалов Пятой междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию истор. факультета ; Брест, 23−24 нояб. 2011 г. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; редкол.: М.Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест : БрГУ, 2012. – С. 22–30.

***Vabishchevich A.M.*** **Department of History of the Slavic Peoples Brest State University named after A.S. Pushkin: Condition, Results, Prospects of Scientific and Research Work**

Presentation of the Department of History of the Slavic peoples of Brest State University named after A.S. Pushkin reveals the main directions of scientific activities, achievements and future plans of professors and teachers. The results of the historical, social and humanities research department has received the recognition of the scientific community in Belarus and abroad.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 30.10.2014